Источник: "Краязнаўчая газета" - 2017-12-28

# Збіраліся экскурсаводы і гіды

***9 снежня ў канферэнц-зале музея Вялікай Айчыннай вайны адбыўся другі з'езд Беларускага грамадскага аб'яднання экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў, якім кіруе Мікола Чырскі.***

Перад аўдыторыяй (на мерапрыемстве прысутнічала 120 чалавек) выступіў археолаг, намеснік дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вадзім Лакіза. Слова таксама браў сп. Чырскі, які паразважаў аб праблемах экскурсійна-спазнавальчага турызму, пра становішча экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў краіны ва ўмовах рынку і праблемах узаемадзеяння дзяржаўных, грамадскіх і камерцыйных структураў па развіцці экскурсійнага бізнесу. І адказаў на шматлікія пытанні.

Таксама перад прысутнымі выступілі Тамара Федарцова, Ларыса Карагодава, Таццяна Хвагіна, Сяргей Тарасаў, Сяргей Бусько, Віталь Карнялюк, Наталля Сергіенка, Валянціна Мятліцкая, Ларыса Бібік, Павел Каралёў.

Мне асабіста вельмі спадабаўся даклад Антаніны Хатэнка, які меў назву «Традыцыйная народная культура як праява этнічнай ідэнтыфікацыі ў кантэксце экскурсійна-спазнаваўчага турызму». Спн. Хатэнка заўсёды цікава паслухаць, бо яна і сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў, і этнакультуролаг.



Усе прысутныя на з'ездзе атрымалі бясплатна кнігу Леаніда Лыча «Краязнаўства – крыніца ведаў і нацыянальнага сталення», якую ў 2004 годзе выдаў Беларускі фонд культуры.

***Аляксей ШАЛАХОЎСКІ***

Аляксей Шалахоўскі. Збіраліся экскурсаводы і гіды